УДК 398

***Б.А. Крук (B.A. Kruk),***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Мазырскі дзяржаўны педагагічны*
*ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна,*
*г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

# САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПРАДМЕТНЫХ І АСОБАСНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ

*Анатацыя. У артыкуле разглядаецца спецыфіка заданняў і роля самастойнай працы па методыцы выкладання беларускай мовы ў прафесійным развіцці асобы будучага настаўніка пачатковых класаў.*

*Ключавыя словы:кампетэнцыі, прадметныя кампетэнцыі, асобасныя кампетэнцыі, самастойная праца.*

# INDEPENDENT WORK AS A MEANS OF FORMING STUDENTS' SUBJECT AND PERSONAL COMPETENCIES

*Abstract. The article examines the specifics of tasks and the role of independent work of methodology of teaching the Belarusian language in the professional development of the personality of a future primary school teacher.*

*Keywords: competencies, subject competencies, personal competencies, independent work.*

МГПУ им. И.П. Шамякина

Самастойная праца студэнта па пэўнай вучэбнай дысцыпліне найменш вывучана і асветлена ў метадычнай літаратуры. Некаторыя вучоныя разглядаюць яе як многабаковую поліфункцыянальную і значымую дзейнасць [1]. Аб'ядноўвае даследчыкаў гэтага складанага віду вучэбнай дзейнасці студэнта тое, шта самастойная праца характарызуецца як асабістая пазнавальная патрэбнасць студэнта.

Есць у студэнта жаданне знайсці нешта новае для сябе, патрэбнае для будучай прафесійнай дзейнасці – ён будзе працаваць самастойна. Гэтую думку мы заўседы падкрэсліваем сваім студэнтам, каб стварыць перадумовы з'яўлення патрэбнасці працаваць самастойна. Пры такім падыходзе самастойная праца студэнта па пэўным вучэбным прадмеце – многабаковая вучэбная дзейнасць, бо мае не толькі вучэбна-пазнавальнае значэнне, але і асобасную скіраванасць.

У кантэксце кампетэнтнаснага падыходу самастойная праца – гэта дзейнасць, якая павінна развіваць важныя для будучага настаўніка асобасныя якасці: самастойнасць, самаарганізаванасць і самакантроль. Акцэнт на фарміраванне кампетэнцый і асобаснае развіцце і самаўдасканаленне зроблены і ў новай рэдакцыі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі [2, с. 5; с. 10; с. 53].

Разгледзім спецыфіку самастойнай працы па методыцы выкладання беларускай мовы і выявім яе ролю ў прафесійным развіцці асобы будучага настаўніка пачатковых класаў.

У сістэме заняткаў па вывучэнні прадмета "Методыка выкладання беларускай мовы" студэнтам прапанаваны розныя заданні для самастойнай працы, якія ахопліваюць усе раздзелы вучэбнай дысцыпліны. Вось некаторыя з іх:

1. Праілюструйце выкарыстанне аднаго з метадаў навучання мове пры тлумачэнні новай тэмы. Падрыхтуйце нагляднасць для тлумачэння.

2. Падрыхтйце сістэму практыкаванняў для засваення вучнямі арфаграмы і выпрацоўкі ўменняў і навыкаў яе прымяняць:

а) правапіс слоў з літарамі *о, э – а;*

б) правапіс слоў з літарамі *е, е – я;*

в) напісанне вялікай літары ў словах;

г) правапіс прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, прад-, перад-;*

д) правапіс апострафа пасля прыставак.

3. Прааналізуйце алгарытм:

а) вызначэння суфіксаў у слове (3 клас, ч. 2, с. 34);

б) разбору слова па саставе (3 клас, ч. 2, с. 40);

в) вызначэння сувязі слоў у сказе (3 клас, ч. 1, с. 80);

4. Растлумачце сутнасць прыватнаметадычных прынцыпаў навучання беларускай арфаграфіі.

5. Раскрыйце сутнасць паняццяў:

а) "арфаграфічная пісьменнасць"

б) "арфаграфічная пільнасць";

в) "арфаграфічнае дзеянне";

г) "арфаграфічнае правіла";

д) "арфаграфічны навык" і інш.

6. Падрыхтуйце паведамленне на тэму:

– Дыдактычная гульня на ўроку беларускай мовы.

– Камунікатыўныя метады навучання мове.

– Дыялог, яго віды і месца на ўроку беларускай мовы.

– Моўны аналіз, яго віды і месца на ўроку беларускай мовы.

7. Прааналізуйце адну з метадычных распрацовак, змешчаных у часопісе "Пачатковая школа" (напр.: Лісоўская, Н.М. Змяненне прыметнікаў па родах.– 2023.– № 1.– С. 26 – 28).

8. Падбярыце дыдактычны матэрыял да тэмы:

– Адзіночны і множны лік дзеясловаў.

– Час дзеясловаў.

– Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах.

Аналіз заданняў для самастойнай працы паказвае, што гэта практыкаванні на тлумачэнне розных метадычных паняццяў, на падбор дыдактычнага матэрыялу да пэўнай тэмы, ілюстраванне выкарыстання метадаў, прыемаў, сродкаў навучання. Значнае месца ў сістэме вучэбных заняткаў па методыцы выкладання беларускай мовы займае падрыхтоўка студэнтамі фрагментаў урокаў, распрацоўка планаў-канспектаў урокаў і іх аналіз.

Самастойная праца, з аднаго боку, скіравана на павышэнне прадметных кампетэнцый студэнта, з другога – патрабуе ад студэнта высокага ўзроўню адказнасці і самадысцыпліны. Яна спрыяе асобаснаму развіццю студэнта. Выкладчык забяспечвае педагагічнае суправаджэнне самастойнай працы студэнтаў. Гэта, на наш погляд, асноўнае яго прызначэнне. Яму не патрэбна параўноўваць студэнтаў, іх узровень падрыхтоўкі, а неабходна бачыць развіцце кожнага студэнта, кансультаваць і садзейнічаць іх самастойнай дзейнасці, фарміраваць прадметныя і асобасныя кампетэнцыі студэнтаў.

На вучэбных занятках па методыцы выкладання беларускай мовы самастойна студэнты працуюць індывідуальна, у парах і невялікімі групамі, што спрыяе развіццю розных асобасных якасцей: адказнасці за вынік сваей дзейнасці і працы партнера,

МГПУ им. И.П. Шамякина

ўменне працаваць на вынік у межах мікрагрупы, ацэньваць ролю кожнага за вынік агульнай працы. Такі падыход для арганізацыі самастойнай працы развівае ў студэнтаў самаарганізаванасць і самакантроль як асобасныя якасці.

Самастойную працу трэба разглядаць як спецыфічны від дзейнасці. Яна патрэбна тады, калі ў студэнта ўзнікае неабходнасць самастойна знайсці матэрыял, які яго зацікавіў. Праблемнае пытанне прапануе студэнтам выкладчык. Напр.: Ці хацелі б вы даведацца аб гісторыі стварэння песні "Жураўлі". Студэнтам было прапанавана самастойна знайсці звесткі ў інтэрнэт-крыніцах і падрыхтаваць паведамленне на тэму "Песня "Жураўлі" – трагічная гісторыя пра лес сям'і Газданавых".

Студэнтамі было прапанавана некалькі варыянтаў паведамлення. Лепшым быў адзначаны наступны варыянт:

*"У сям'і Газданавых было сямера сыноў. Маці вельмі ганарылася сваімі сынамі – усе іх паважаюць. Бацька радаваўся – выраслі сыны працавітыя.*

*Але вось настаў час выпрабаванняў – прыйшоў 1941 год і паклікаў сыноў Газданавых зямлю сваю абараняць ад чужаземцаў. Усіх сыноў раскідала па франтах вайна.*

*Першы сын загінуў у бітве пад Масквой. Два сыны – у 1942 годзе ў час абароны Севастопаля. Сэрца маці не вытрымала такой бяды. Бацька застаўся адзін. Затым ен атрымаў яшчэ тры звесткі, што загінулі сыны ў баях за Наварасійск, Кіеў і Беларусь…*

*У бацькі была надзея – вайна заканчваецца. Ен дачакаецца хоць аднаго з сыноў. Але ў бітве за Берлін загінуў і апошні сын. Паштальен адмовіўся несці бацьку звестку аб тым, што яго апошні сын загінуў. Тады старэйшыны вырашылі: яны самі скажуць бацьку аб гэтым…*

*У 1963 годзе ў сяле ўстанавілі абеліск: маці і сем жураваў, якія адлятаюць у неба. Расул Гамзатаў наведаў гэты помнік. Ен быў уражаны расказамі мясцовых жыхароў і хутка напісаў верш "Жураўлі". Верш быў надрукаваны і трапіў у рукі Марку Бернесу, які чытаў верш і плакаў. Ен адчуў, што словы верша – гэта сумная, трагічная песня аб вайне.*

*Ян Фрэнкель напісаў музыку. Песня была запісана без рэпетыцый, з першага дубля. Праз месяц Марка Бернеса не стала – гэта была яго апошняя песня.*

У інтэрнэт-крыніцах студэнтаў мала цікавяць матэрыялы маральна-этычнага і патрыятычнага зместу. Заданне, якое яны атрымалі, патрабавала вывучэння менавіта такіх матэрыялаў. Яно было скіравана на самастойную працу па афармленні звязнага выказвання і падрыхтоўцы прэзентацыі да яго.

Нельга сцвярджаць, што гэта кардынальна новы падыход да арганізацыі самастойнай працы. Але любая традыцыйная форма правядзення заняткаў, як вядома, можа мець элемент творчасці. У гэтым выпадку ўнутраны пазнавальны матыў, як сцвярджаюць псіхолагі, не пакінуў раўнадушным ніводнага студэнта, бо ўсе яны ўдзельнічалі ў агульнай працы. Гэты матэрыял, дарэчы, настаўнік можа выкарыстаць не толькі на ўроках літаратурнага чытання ў 4 класе пры вывучэнні раздзелаў "Лес чалавека на вайне" і "Чалавек і Радзіма", але і на ўроках беларускай мовы, калі вучні працуюць з тэкстамі "Адважны" (4 клас, ч. 1, с. 89) і "Вечны агонь" (4 клас, ч. 2, с. 81).

Студэнты рыхтуюць паведамленні самастойна, выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, на наступныя тэмы: пра подзвіг юнага партызана Марата Казея, пра абаронцаў Брэсцкай крэпасці, пра касманаўтаў-беларусаў,

МГПУ им. И.П. Шамякина

пра слуцкіх ткачоў – стваральнікаў нацыянальнага скарбу – беларускага пояса і інш. Такія паведамленні павінны быць узорам звязнага маўлення.

Самастойная праца разглядаецца намі як важнейшае звяно ў фарміраванні моўна-метадычных уменняў і навыкаў і развіцці прадметных і асобасных кампетэнцый будучага настаўніка. Агульнавядома, што веды, набытыя студэнтам самастойна, знаходзяцца заўседы ў яго актыве.

Вучэбная дзейнасць студэнта па вучэбным прадмеце "Методыка выкладання беларускай мовы" ўключае аўдыторную, пазааўдыторную, дамашнюю і самастойную працу. Як паказваюць асабістыя назіранні і аналіз вопыту калег, самастойная праца мае і вучэбнае, і асобаснае значэнне. Яна спрыяе фарміраванню вучэбна-метадычных уменняў і навыкаў, узбагачае, развівае прафесійную кампетэнтнасць будучага настаўніка пачатковых класаў. З другога боку, самастойная праца студэнта садзейнічае яго асобаснаму развіццю, патрабуе самаарганізаванасці, самадысцыпліны і асабістай адказнасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Смирнов, С.Д. Педагогика и психология высшего образования: от деятельности к личности / С.Д. Смирнов. – М., 2003. – 304 с.

2. Кодекс Республики Беларусь об образовании : по состоянию на 1 сент. 2022 г.– Минск : Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2022.– 512 с.

УДК 378.091.21

***Е.В. Кузьменко (E.V. Kuzmenko),***
*Мозырский государственный педагогический университет имени И.П. Шамякина,*
*г. Мозырь, Республика Беларусь*

## ФОРМИРОВАНИЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ГОТОВНОСТИ БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ К РАЗВИТИЮ СУБЪЕКТНОСТИ ОБУЧАЮЩИХСЯ В УСЛОВИЯХ ГЕТЕРОГЕННОЙ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ СРЕДЫ

*Аннотация. В статье обозначена актуальность в педагогическом образовании проблемы формирования профессиональной готовности будущих педагогов к развитию субъектности обучающихся в условиях гетерогенных групп. Раскрывается сущность понятий гетерогенности образовательной среды и субъектности обучающихся. Разработана модель формирования профессиональной готовности будущих педагогов к развитию субъектности обучающихся в условиях гетерогенной образовательной среды.*

*Ключевые слова: гетерогенность, гетерогенная группа, субъектность обучающихся, модель профессиональной подготовки педагога.*

## FORMATION OF PROFESSIONAL READINESS OF FUTURE TEACHERS TO DEVELOP STUDENTS' SUBJECTIVITY IN A HETEROGENEOUS EDUCATIONAL ENVIRONMENT

*Abstract. The article highlights the relevance of the issue of forming the professional readiness of future teachers to develop students' subjectivity in heterogeneous groups within the context of teacher education. The essence of the concepts of heterogeneity in the educational environment and students' subjectivity is revealed. A model for the formation of professional readiness of future teachers to develop students' subjectivity in a heterogeneous educational environment has been developed.*

*Keywords: heterogeneity, heterogeneous group, students' subjectivity, model of teacher professional training.*

МГПУ им. И.П. Шамякина